***Сказы з аднароднымі членамі*** *(8 клас)* I варыянт

*1.Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:* а) адказваюць на адно і тое ж пытанне; б) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў; в) адносяцца да аднаго і таго ж слова; г) выконваюць адналькавую сінтаксічную функцыю; д) можна паставіць пытанне ад аднаго слова да другога.

*2.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі:* а) Белая заслона снегу закрывала ***будынкі*** і ***двары***; б) Навокал усё ***гуло, трэслася, выла, скуголіла***; в) Ні ***канца*** ні ***краю*** не відаць пустыні; г) А журавель ***махаў*** і ***махаў*** аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог; д) Навокал ***сцішана, стоена*** радавалася цеплыні і сонцу поле.

*3.Адзначце сказы з двума радамі аднародных членаў:* а) З тае восені можна было і спяваць, і размаўляць, і вучыцца на роднай мове; б) І неба, і зямля зліліся ў суцэльным віхры снежнага пылу і цемры; в) У гэтым крыку былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок да нас, дарослых і разумных людзей; г) Сустрэліся хваінка з ялінкаю, абняліся; д) Нічога не кажа бацька, маўчыць, упарта, сцята маўчыць.

*4.Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца аднароднымі:* а) Яна яшчэ доўга глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай той цёмны майскі адвячорак; б) Быў цёплы чэрвеньскі дзень; в) Можа, маці нагадаўся яе басаногі хлопчык Віця, віхрасты, рухавы і настойлівы? г) Байцы паўзлі па снежным полі і раптам у вячэрняй цішыні пачулі слабы чалавечы голас; д) А ў душы ўжо шырыліся, грымелі тугой пяшчотныя, дарагія ўспаміны з таго далёкага, што стала ўжо мінулым.

*5.Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:* а) Данік не сцярпеў, наважыўся быў устаць і расказаць, як усё было; б) Зарава пажару калыхалася над ракою, над лесам, запальваючы крывавай чырванню рэдкія хмурынкі ў небе; в) Жыццё неяк памеркла адразу, стала шэрым, панурым; г) Нас вабілі прыгоды, небяспечныя, але цікавыя падарожжы ў незнаёмыя краіны, пошукі скарбаў, сутычкі з ворагамі, пагоні, подзвігі, высакародныя пачуцці, пазнанне свету, што быў далёка ад нас; д) Навокал непранікальная заслона снегу, дзе ўсё мітусілася, рухалася, хадзіла ходырам, бы ў нейкім тлумным дзікім танцы.

*6.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:* а) Сын жа кінууся да дзвярэй, з усяе сілы націснуў на клямку рукамі, выскачыў на двор_ і ўжо там моцна заплакаў; б) Пах напаўняў хату_ расплываўся па двары_ падбадзёрваў_ абуджаў радасць; в) Сякера гучала нячаста_ рытмічна; г) Праз гадзіну яны ўжо добра адышліся ад таго балота_ ды брылі па пахілым доўгім касагоры; д) Ні Міця_ ні я тады нават не здагадваліся, што цікавае ёсць і паблізу нас.

*7.Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць двукроп'е:* а) Побач з букетам ляжала шмат іншых кветак чырвоныя гваздзікі, ружы, белыя рамонкі; б) На сене валяліся вялікія і маленькія камякі, пер'е, пух усё, што засталося ад нядаўняга гнязда; в) Патап Хведаравіч радаваўся сынавай падмозе, вучыў Якуба, як лячыць сосны, дубы, бярозы, яліны; г) Падышоў гружаны цягнік жалезныя платформы з гарматамі, некалькі закрытых вагонаў, дзясятак цыстэрнаў; д) На гэтым невялічкім вадаёме вадзілася шмат рыбы серабрыстыя карасікі, уюны, іншая драбяза.

*8.Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў:* а) Даўно павыгаралі, павыліналі кветкі, паблякла нават неба, і ўсё гэта, здавалася, было зараз аднаго рыжага колеру **[О, О, О]**; б) Тут жа была і рачулка, бойкая і жвавая **[і О, О і О]**; в) Грыбы, ягады, арэхі, шчаўе на лугавінах – усё неслі дамоў **[О, О, О, О – @]**; г) Як загадкавы чараўнік, раскладвае ён колеры, рэзкія, свежыя, без паўтонаў **[О, О, О]**; д) Выйдзе гарнастай на паляванне звечара, абыдзе свой паляўнічы ўчастак, паловіць мышэй, а то і ў вёску забрыдзе, а пад раніцу вернецца ў сваё сховішча і будзе чакаць там новага вечара **[О, О, О, а то і О, а О, О]**.

**Тэкст да заданняў 9, 10**

Высачэзныя магутныя дубы кідаюцца ў вочы здалёк. Яны ўзвышаюцца над усімі і складаюць найбольшую славу зямлі, якая іх узгадавала. Але яны зусім не прыніжаюць высакароднай годнасці выносістых карабельных сосен, кашлатых вастраверхіх ялін, кучаравых клёнаў і цяністых ліп, мускулістых вязаў і светлалістых ясеняў. Добра чуюцца ў гэтай грамадзе і белакорыя бярозы, і трапяткія асіны, і лагодныя таполі, і сціплыя вольхі... А ў цэлым атрымліваецца незвычайная гармонія фарбаў і тонаў, дзівосная сімфонія гукаў і шумаў!..

*9.Вызначце, які сродак сувязі ўжыты для сувязі першых трох сказаў:* а) прыслоўі; б) займеннікі; в) сінонімы; г) паўтор слоў; д) часціцы.

*10.Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам* ___________

***Сказы з аднароднымі членамі*** *(8 клас)* II варыянт

*1.Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:* а) вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння; б) з’яўляюцца раўнапраўнымі па сваім саставе спалучэннямі слоў; в) адносяцца да аднаго і таго ж слова; г) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў; д) выконваюць розную сінтаксічную ролю.

*2.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца аднароднымі членамі:* а) Навокал ***пясок*** ды ***пясок***; б) Гэта мясціна ***чырвонагаловых*** падасінавікаў і ***белых высокіх*** чашчавікоў; в) Гэта, брат, не ***дажджы***, а ***золата***; г) ***Уздыхалі, плакалі*** жанчыны, ***углядаліся*** ў злавесныя водсветы начных пажараў; д) І думкі твае, сагрэтыя цяплом, узнімуцца і ***паплывуць, паплывуць***...

*3.Адзначце сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:* а) Усё часцей наведваліся немцы, шукалі зброю, партызан; б) Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся; в) Ногі шасталі па няезджанай дарозе паўз маўклівы і цёмны бярэзнік, разграбаючыігліцу і апалае лісце, якога тут багата пазбіраў вецер і прыбілі цяжкія асеннія росы; г) Мінуць, прашапочуць лісцем акацый і вербаў гады ў невялічкай прыдняпроўскай вёсачцы; д) Разлажылі вялікае цяпло, наладзілі з яловых лапак ды сена добрую пасцель для Гені, ухуталі яе цяплей.

*4.Адзначце сказы, у якіх азначэнні з’яўляюцца неаднароднымі:* а) Была золкая зімовая раніца; б) Трэба было пераадолець чыстае, заснежанае поле перад станцыяй Гаршчэчнае; в) Гэта адбылося ў самым канцы вайны ў аўстрыйскіх Альпах, куды ўжо ўладарна прыйшла апошняя ваенная вясна г) Бушуе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку; д) Сняжок дробненькі, гусценькі сыпаў і сыпаў зверху.

*5.Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:* а) Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень; б) Людзі даўно забыліся пра песні, пра вясёлае слова; в) Лішак гарачыні паглынаюць і рака, і зараснікі аеру, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зяляніна; г) Зрабіўшы з дзясятак мудрагелістых паваротаў і перасекшы некалькі невялічкіх палянак, узгоркаў і пералескаў, мы неяк раптоўна выйшлі да палетка і спыніліся каля збажыны; д) Сонца адарвалася раптам ад балота, на хвіліну павісла над травою, над купінамі і пачало ўзнімацца вышэй, над лазняком і бярэзнікам.

*6.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:* а) Яна не разумела ўсяго, але верыла_ і не адгаворвала, не ўпрошвала яго; б) Можа, яна суцяшала сябе тым, што яе сын Віця_ хоць і загінуў, але жыве на свеце інакшым жыццём – яго памятаюць другія; в) На круглым_ у маршчынах яе твары былі сум і гора; г) Наляцелі шэрай хмарай ненавісныя_ бязлітасныя_ чужынцы; д) На лісціку трыпутніку сядзіць матылёк, дыхае крыльцамі_ залацістымі, рознакаляровымі.

*7.Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць працяжнік:* а) Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач, Бярэзінскі запаведнік і маленькая рэчка Проня ўсё гэта наш родны край, наша спадчына; б) І колькі яшчэ было розных кветак сініх, ліловых, ярка-чырвоных! в) На гэты час і машыны, і спрэчкі, і штодзённая мітусня ўсе засталіся недзе далёка-далёка; г) Сюды, да крынічкі, прыходзіць і прылятае ўсё лясное насельніцтва ласі і ваўкі, лісы і зайцы, дзікі і алені; д) Якуба Коласа можна было бачыць усюды на вуліцах і плошчах сталіцы, каля зямлянак у далёкіх вёсках.

*8.Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў:* а) Яшчэ чыталі мы адзін аднаму свае вершы, правілі іх або нават і разам складалі вершаваныя творы для нашай насценнай газеты **[О, О або О]**; б) Нямала пра гэта могуць расказаць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, звычаі, абрады, а таксама апісанні родных мясцін пісьменнікамі мінулых стагоддзяў **[О, О, О]**; в) На вуліцы, у дварах, каля будынкаў, уздоўж платоў – усюды ляжалі горы снегу з самымі вычварнымі паветкамі і карнізамі **[О, О, О, О]**; г) Піліп Андрэевіч завярнуў лодку ў затоку, паціху заехаў у траву, рукамі зlaвіў качанятка, потым адвёз яго ў самы канец затокі, дзе чуўся крык старое качкі, і выпусціў на чыстую ваду **[О, О, О, О, О]**; д) Кожную раніцу, з першымі промнямі сонца, ідуць на працу ў лес супрацоўнікі запаведніка: егеры, фенолагі, заолагі, батанікі, леснікі **[@: О, О, О, О, О]**.

**Тэкст да заданняў 9, 10**

Народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ нідзе і ніколі не забываў сваё роднае Палессе, аблогі яго балот і пушчаў, сакавітую зяляніну і разнатраўе шырокіх прыпяцкіх і прыдняпроўскіх лугоў, багацце рачулак і азярын, раздолле ўрадлівых палёў і духмяных садоў. Самымі дарагімі і незабыўнымі былі яго ўспаміны пра сваю радню, самабытных, непасрэдных і шчырых землякоў-палешукоў, непаўторныя Глінішчы, Юравічы, Тунеўшчыну, Тур’ю

*9.Вызначце, які сродак сувязі ўжыты для сувязі першых трох сказаў:* а) прыслоўе; б) займеннік; в) сінонімы; г) паўтор слоў; д) часціца.

*10.Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам* ___________

***Сказы з аднароднымі членамі*** *(8 клас)* І варыянт

*1.Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:* **а)** адказваюць на адно і тое ж пытанне; б) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў; **в)** адносяцца да аднаго і таго ж слова; **г)** выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю; д) можна паставіць пытанне ад аднаго слова да другога.

*2.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі:* **а)** Белая заслона снегу закрывала ***будынкі*** і ***дворы***; **б)** Навокал усё ***гуло, трэслася, выла, скуголіла***; в) Ні ***канца*** ні ***краю*** не відаць пустыні; г) А журавель ***махаў*** і ***махаў*** аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог; **д)** Навокал ***сцішана, стоена*** радавалася цеплыні і сонцу поле.

*3.Адзначце сказы з двума радамі аднародных членаў:* а) З тае восені можна было і спяваць, і размаўляць, і вучыцца на роднай мове; **б)** І неба, і зямля зліліся ў суцэльным віхры снежнага пылу і цемры; **в)** У гэтым крыку былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок да нас, дарослых і разумных людзей; г) Сустрэліся хваінка з ялінкаю, абняліся; **д)** Нічога не кажа бацька, маўчыць, упарта, сцята маўчыць.

*4.Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца аднароднымі:* а) Яна яшчэ доўга глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай той цёмны майскі адвячорак; б) Быў цёплы чэрвеньскі дзень; **в)** Можа, маці нагадаўся яе басаногі хлопчык Віця, віхрасты, рухавы і настойлівы? г) Байцы паўзлі па снежным полі і раптам у вячэрняй цішыні пачулі слабы чалавечы голас; **д)** А ў душы ўжо шырыліся, грымелі тугой пяшчотныя, дарагія ўспаміны з таго далёкага, што стала ўжо мінулым.

*5.Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:* **а)** Данік не сцярпеў, наважыўся быў устаць і расказаць, як усё было; б) Зарава пажару калыхалася над ракою, над лесам, запальваючы крывавай чырванню рэдкія хмурынкі ў небе; **в)** Жыццё неяк памеркла адразу, стала шэрым, панурым; г) Нас вабілі прыгоды, небяспечныя, але цікавыя падарожжы ў незнаёмыя краіны, пошукі скарбаў, сутычкі з ворагамі, пагоні, подзвігі, высакародныя пачуцці, пазнанне свету, што быў далёка ад нас; **д)** Навокал непранікальная заслона снегу, дзе ўсё мітусілася, рухалася, хадзіла ходырам, бы ў нейкім тлумным дзікім танцы.

*6.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:* а) Сын жа кінуўся да дзвярэй, з усяе сілы націснуў на клямку рукамі, выскачыў на двор_ і ўжо там моцна заплакаў; **б)** Пах напаўняў хату_ расплываўся па двары_ падбадзёрваў_ абуджаў радасць; **в)** Сякера гучала нячаста_ рытмічна; г) Праз гадзіну яны ўжо добра адышліся ад таго балота_ ды брылі па пахілым доўгім касагоры; **д)** Ні Міця_ ні я тады нават не здагадваліся, што цікавае ёсць і паблізу нас.

*7.Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць двукроп'е:* а) Побач з букетам ляжала шмат іншых кветак чырвоныя гваздзікі, ружы, белыя рамонкі; б) На сене валяліся вялікія і маленькія камякі, пер'е, пух усё, што засталося ад нядаўняга гнязда; в) Патап Хведаравіч радаваўся сынавай падмозе, вучыў Якуба, як лячыць сосны, дубы, бярозы, яліны; **г)** Падышоў гружаны цягнік жалезныя платформы з гарматамі, некалькі закрытых вагонаў, дзясятак цыстэрнаў; **д)** На гэтым невялічкім вадаёме вадзілася шмат рыбы серабрыстыя карасікі, уюны, іншая драбяза.

*8.Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў:* а) Даўно павыгаралі, павыліналі кветкі, паблякла нават неба, і ўсё гэта, здавалася, было зараз аднаго рыжага колеру **[О, О, О]**; б) Тут жа была і рачулка, бойкая і жвавая **[і О, О і О]**; **в)** Грыбы, ягады, арэхі, шчаўе на лугавінах – усё неслі дамоў **[О, О, О, О – @]**; **г)** Як загадкавы чараўнік, раскладвае ён колеры, рэзкія, свежыя, без паўтонаў **[О, О, О]**; д) Выйдзе гарнастай на паляванне звечара, абыдзе свой паляўнічы ўчастак, паловіць мышэй, а то і ў вёску забрыдзе, а пад раніцу вернецца ў сваё схованшча і будзе чакаць там новага вечара **[О, О, О, а то і О, а О, О]**.

**Тэкст да заданняў 9, 10**

Высачэзныя магутныя дубы кідаюцца ў вочы здалёк. Яны ўзвышаюцца над усімі і складаюць найбольшую славу зямлі, якая іх узгадавала. Але яны зусім не прыніжаюць высакароднай годнасці выносістых карабельных сосен, кашлатых вастраверхіх ялін, кучаравых клёнаў і цяністых ліп, мускулістых вязаў і светлалістых ясеняў. Добра чуюцца ў гэтай грамадзе і белакорыя бярозы, і трапяткія асіны, і лагодныя таполі, і сціплыя вольхі... А ў цэлым атрымліваецца незвычайная гармонія фарбаў і тонаў, дзівосная сімфонія гукаў і шумаў!..

*9.Вызначце, які сродак сувязі ўжыты для сувязі першых трох сказаў:* а) прыслоўі; **б)** займеннікі; в) сінонімы; г) паўтор слоў; д) часціцы.

*10.Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам* **шэсць**

***Сказы з аднароднымі членамі*** *(8 клас)* II варыянт

*1.Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:* **а)** вымаўляюцца з інтанацыяй пералічэння; **б)** з'яўляюцца раўнапраўнымі па сваім саставе спалучэннямі слоў; **в)** адносяцца да аднаго і таго ж слова; г) удакладняюць, канкрэтызуюць сэнс папярэдніх слоў; д) выконваюць розную сінтаксічную ролю.

*2.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца аднароднымі членамі:* а) Навокал ***пясок*** ды ***пясок***; б) Гэта мясціна ***чырвонагаловых*** падасінавікаў і ***белых высокіх*** чашчавікоў; **в)** Гэта, брат, не ***дажджы***, а ***золата***; **г)** ***Уздыхалі, плакалі*** жанчыны, ***углядаліся*** ў злавесныя водсветы начных пажараў; д) І думкі твае, сагрэтыя цяплом, узнімуцца і ***паплывуць, паплывуць...***

*3.Адзначце сказы з некалькімі радамі аднародных членаў:* **а)** Усё часцей наведваліся немцы, шукалі зброю, партызан; б) Спыніцеся, не ідзіце далей у лес і ўслухайцеся; **в)** Ногі шасталі па няезджанай дарозе паўз маўклівы і цёмны бярэзнік, разграбаючы ігліцу і апалае лісце, якога тут багата пазбіраў вецер і прыбілі цяжкія асеннія росы; **г)** Мінуць, прашапочуць лісцем акацый і вербаў гады ў невялічкай прыдняпроўскай вёсачцы; **д)** Разлажылі вялікае цяпло, наладзілі з яловых лапак ды сена добрую пасцель для Гені, ухуталі яе цяплей.

*4.Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца неаднароднымі:* **а)** Была золкая зімовая раніца; б) Трэба было пераадолець чыстае, заснежанае поле перад станцыяй Гаршчэчнае; **в)** Гэта адбылося ў самым канцы вайны ў аўстрыйскіх Альпах, куды ўжо ўладарна прыйшла апошняя ваенная вясна **г)** Бушуе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку; д) Сняжок дробненькі, гусценькі сыпаў і сыпаў зверху.

*5.Адзначце сказы, у якіх ёсць аднародныя выказнікі:* а) Завіруха бушавала ўсю ноч і ўвесь дзень; б) Людзі даўно забыліся пра песні, пра вясёлае слова; в) Лішак гарачыні паглынаюць і рака, і зараснікі аеру, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зеляніна; **г)** Зрабіўшы з дзясятак мудрагелістых паваротаў і перасекшы некалькі невялічкіх палянак, узгоркаў і пералескаў, мы неяк раптоўна выйшлі да палетка і спыніліся каля збажыны; **д)** Сонца адарвалася раптам ад балота, на хвіліну павісла над травою, над купінамі і пачало ўзнімацца вышэй, над лазняком і бярэзнікам.

*6.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў патрэбна паставіць коску:* а) Яна не разумела ўсяго, але верыла_ і не адгаворвала, не ўпрошвала яго; б) Можа, яна суцяшала сябе тым, што яе сын Віця_ хоць і загінуў, але жыве на свеце інакшым жыццём – яго памятаюць другія; **в)** На круглым_ у маршчынах яе твары былі сум і гора; г) Наляцелі шэрай хмарай ненавісныя_ бязлітасныя_ чужынцы; **д)** На лісціку трыпутніку сядзіць матылёк, дыхае крыльцамі_ залацістымі, рознакаляровымі.

*7.Адзначце сказы, у якіх патрэбна паставіць працяжнік:* **а)** Белавежская пушча і Браслаўскія азёры, Палессе і Свіцязь, Налібокі і Нарач, Бярэзінскі запаведнік і маленькая рэчка Проня ўсё гэта наш родны край, наша спадчына; б) І колькі яшчэ было розных кветак сініх, ліловых, ярка-чырвоных! **в)** На гэты час і машыны, і спрэчкі, і штодзённая мітусня ўсе засталіся недзе далёка-далёка; г) Сюды, да крынічкі, прыходзіць і прылятае ўсё лясное насельніцтва ласі і ваўкі, лісы і зайцы, дзікі і алені; д) Якуба Коласа можна было бачыць усюды на вуліцах і плошчах сталіцы, каля зямлянак у далёкіх вёсках.

*8.Адзначце прыклады, у якіх схема правільна перадае сувязь аднародных членаў:* **а)** Яшчэ чыталі мы адзін аднаму свае вершы, правілі іх або нават і разам складалі вершаваныя творы для нашай насценнай газеты **[О, О або О]**; б) Нямала пра гэта могуць расказаць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, звычаі, абрады, а таксама апісанні родных мясцін пісьменнікамі мінулых стагоддзяў **[О, О, О]**; в) На вуліцы, у дварах, каля будынкаў, уздоўж платоў – усюды ляжалі горы снегу з самымі вычварнымі паветкамі і карнізамі **[О, О, О, О]**; г) Піліп Андрэевіч завярнуў лодку ў затоку, паціху заехаў у траву, рукамі зглавіў качанятка, потым адвёз яго ў самы канец затокі, дзе чуўся крык старое качкі, і выпусціў на чыстую ваду **[О, О, О, О, О]**; **д)** Кожную раніцу, з першымі промнямі сонца, ідуць на працу ў лес супрацоўнікі запаведніка: егеры, фенолагі, заолагі, батанікі, леснікі **[@: О, О, О, О, О]**.

**Тэкст да заданняў 9, 10**

Народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ нідзе і ніколі не забываў сваё роднае Палессе, аблогі яго балот і пушчаў, сакавітую зеляніну і разнатраўе шырокіх прыпяцкіх і прыдняпроўскіх лугоў, багацце рачулак і азярын, раздолле ўрадлівых палёў і духмяных садоў. Самымі дарагімі і незабыўнымі былі яго ўспаміны пра сваю радню, самабытных, непасрэдных і шчырых землякоў-палешукоў, непаўторныя Глінішчы, Юравічы, Тунеўшчыну, Тур'ю

*9.Вызначце, які сродак сувязі ўжыты ў тэксце:* а) прыслоўе; **б)** займеннік; в) сінонімы; г) паўтор слоў; д) часціца.

*10.Вызначце, колькі радоў аднародных членаў ужыта ў тэксце. Адказ запішыце словам* **дзевяць**